© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011


# БАЦЬКАЎШЧЫНА

ОРГАН БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНА-ВЫЗВОЛЬНАЙ ДУМКІ

DIE WEISSRUTHENISCHE ZEITUNG „BAĆKAUŠČYNA“ („VATERLAND“)

Herausgeber: Wladimir BORTNIK
Die Administration: (13b) München 15, Schwanthalerstr. 48/II, Rückgebäude

Druck: „LOGOS“, Buchdruckerei u. Verl., G.m.b.H., München 8, Rosenheimer Str. 46 a

**Цана паза Нямеччынай:** ЗША — 15 цэнтаў, Канада — 15 ц., Ангельшчына — 1 шылінг, Францыя — 20 фр., Бэльгія — 5 фр., Аўстралія — 1 шылінг, Арґентына — 2 пэзо. У іншых краінах раўнавартасьць 15 ам. цэнтаў. Падпіска на год — з разьліку 52 нумароў, на паўгода — 26 нумароў, на 3 месяцы 13 нумароў паводля вышэйшае цаны. Цана лётніцкай поштай у заакіянскія краіны — 30 ам. цэнтаў. — Падвойныя нумары каштуюць падвойна

ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ — ЦАНА 30 Н. ФЭН.

LE JOURNAL BIELORUSSIEN „LA PATRIE“ | DIE WEISSRUTHENISCHE ZEITUNG „DAS VATERLAND“ | THE WHITERUTHENIAN NEWSPAPER „THE FATHERLAND“

№ 17 (199) | Нядзеля 2 травеня 1954 г. | ГОД ВЫДАНЬНЯ 8


# Пачалася Жэнэўская канфэрэнцыя

У панядзелак 26 красавіка распачалася ў Жэнэве заплянаваная на Бэрлінскай канфэрэнцыі канфэрэнцыя ў справе Далёкага Ўсходу. Фактычна будуць гэта дзьве канфэрэнцыі, кажная зь іншым парадкам дня і зь іншым складам прыймаючых у іх удзел дзяржаваў: канфэрэнцыя ў справе будучыні Карэі, якая мае быць прадугледжанай у дагаворы аб перамір'і палітычнай карэйскай канфэрэнцыяй, што мелася распачацца яшчэ ў верасьні мінулага году, і канфэрэнцыя ў справе спыненьня ваенных дзеяньняў у Індакітаі.

Палітычныя колы розных краінаў прыдаюць Жэнэўскай канфэрэнцыі вялікае значэньне. Калі яна навет закончыцца нічым, чаго трэба спадзявацца, дык усёроўна шырэй выясьніць сытуацыю і паставіць сьвет перад ясьнейшымі заданьнямі. Дык нічога дзіўнага, што як дэмакратычны Захад, гэтак і камуністычны Ўсход старанна прыгатаўляўся да гэтай канфэрэнцыі. Кажны стараўся заняць як найвыгаднейшую для сябе пазыцыю, зь якой будзе гаварыць у Жэнэве. Трэба прызнаць, што найбольш ініцыятывы прысьвяціла Амэрыка. Тут у першую чаргу трэба адцеміць выразнае спрэцызаваньне амэрыканскай пазыцыі ў справе індакітайскай яшчэ перад канфэрэнцыяй. Пайменна, міністар замежных справаў ЗША Дальлес, а потым прэзыдэнт Айзэнгаўэр асьветчылі, што Амэрыка не дапусьціць да апанаваньня камуністымі Індакітаю, бо створыць гэта загрозу для ўсяе паўдзённа-ўсходняе Азіі. Яны асьветчылі, што калі-б навет Францыя скапітулявала ў Індакітаі, дык Амэрыка прыйме сама ўдзел у гэтай вайне і будзе яе весьці аж да пераможнага канца. Гэта паказвае, што Амэрыка будзе ў Жэнэве гаварыць з пазыцыі сілы, з тае адзінае пазыцыі, якую яшчэ рэспэктуюць камуністыя. Мала гэтага. Амэрыканскі міністар замежных справаў Дальлес коратка перад канфэрэнцыяй прыляцеў у Лёндан і Парыж, дзе намагаўся пераканаць ангельскі й францускі ўрады загразіць чырвонаму Кітаю яшчэ перад канфэрэнцыяй, што калі ён будзе аказваць помач камуністычным паўстанцам Ветміну, дык павінен лічыцца, што сьцягне на сябе збройную адплату дзяржаваў Захаду. Праўда, ані ангельскі, ані францускі ўрад на высланьне камуністычнаму Кітаю такога папярэджаньня перад канфэрэнцыяй у Жэнэве не згадзіліся, уважаючы, што такі крок можа старпэдаваць канфэрэнцыю, тым ня меней у Лёндане й Парыжы згадзіліся гэты праект Дальлеса прадыскутаваць. Таксама было дасягнутае пагадненьне з Англіяй і Францыяй у справе заснаваньня Ціхаакіянскага абароннага пакту на ўзор Атлянтычнага пакту ў Эўропе, у які, апрача заходніх дзяржаваў, маюць быць уцягнутыя таксама азіяцкія антыкамуністычныя дзяржавы, Аўстралія й Новазэляндыя. Гэта ўсё паказвае, што Амэрыка моцна наважаная паўстрымаць пашырэньне камунізму ў паўдзённа-ўсходняй Азіі і што гэтую сваю пастанову выканае.

Прыемна адцеміць, што гэтую антыкамуністычную пазыцыю Амэрыкі нагул падзяляе й Вялікабрытанія. У ангельскай прэсе былі пашырыліся слухі, што ангельскі ўрад даў згоду Дальлесу падчас ягонай апошняй візыты ў Лёндане збройна інтэрвэньяваць разам з Амэрыкай у Індакітаі. Каб успакоіць публічную апінію, Чэрчыль выдаў асьветчаньне, што перад Жэнэўскай канфэрэнцыяй Ангельшчына не ўзяла на сябе ніякіх новых забавязаньняў у справе Індакітаю. Але пры гэтым дадаў, што ў выпадку няўдачы Жэнэўскай канфэрэнцыі гэтыя забавязаньні могуць быць зробленыя. Гэтым самым брытанскі прэм'ер падтрымаў пазыцыю амэрыканскую.

Горш справа прадстаўляецца ў самой Францыі. Зацяжная індакітайская вайна, якая ўжо трывае восьмы год, руйнуе матарыяльна краіну й цягне за сабой вялікія ахвяры ў людзях, сталася ў Францыі вельмі непапулярнай, а вялікая часьць грамадзянства дамагаецца скончыць яе навет за ўсякую цану, г. зн. за цану далёкайдучых уступак камуністым. Гэткая пазыцыя Французаў паважна непакоіць англа-амэрыканскі Захад і прадстаўляе сур'ёзную небясьпеку для адзінства дэмакратычнага Захаду.

Другім важным крокам Амэрыкі й Ангельшчыны перад Жэнэўскай канфэрэнцыяй былі новыя пастановы ў справе эўрапэйскай абароннай супольнасьці. Пайменна, каб заахвоціць Францыю да ратыфікаваньня дагавору аб эўрапэйскай арміі, Ангельшчына згадзілася аддаць у распараджэньне гэтай арміі адну сваю панцырную дывізію й трымаць яе на кантынэньце, а таксама ўключыць свае лётніцкія адзінкі да лётніцтва эўрапэйскай арміі й збройных сілаў Атлянтычнага пакту. Пры гэтым ангельскі ўрад асьветчыў, што ён уважае Атлянтычны пакт за бестэрміновы і што не забярэ сваіх збройных сілаў з эўрапэйскага кантынэнту датуль, пакуль існуе эграженьне Эўропы. Пасьля гэтага Амэрыка із свайго боку вуснамі свайго прэзыдэнта асьветчыла, што Задзіночаныя Штаты будуць трымаць свае войскі ў Эўропе ў колькасьці, неабходнай для ейнае абароны, і будуць імкнуцца да стварэньня такой сілы, каб адкінуць эвэнтуальную агрэсію «бязь зьнішчэньня й акупацыі няпрыяцелем якога-небудзь з саюзных краёў». Гэтае асьветчаньне Айзэнгаўэра мае адзін характэрны пункт. У ім гаворыцца, што было-б супярэчным зь інтарэсамі Амэрыкі выступіць з Атлянтычнага пакту тады, калі паўстане эўрапэйская абаронная супольнасьць. Гэта можна разумець, што з Атлянтычнага пакту ў выпадку, калі не паўстане эўрапэйская абаронная супольнасьць, Задзіночаныя Штаты могуць выступіць.

Гэтымі сваімі гарантыямі Задзіночаныя Штаты й Вялікабрытанія стараюцца зьліквідаваць тыя перашкоды, дзеля якіх Францыя ня хоча ратыфікаваць дагавору аб эўрапэйскай абароннай супольнасьці. Гэтыя гарантыі ствараюць важныя перадумовы для паўстаньня эўрапэйскай арміі і адначасна ўзмацняюць пазыцыі Захаду на Жэнэўскай канфэрэнцыі.

Савецкі Саюз таксама выказаў палітычную актыўнасьць перад Жэнэўскай канфэрэнцыяй. Зь ягонае ініцыятывы камуністычныя паўстанцы Ветміну вядуць ад даўжэйшага часу зацяты штурм крэпасьці Дыен-Біен-Пгу, у якой, на тэрыторыі меншай за адзін квадратны кілямэтр, бароніцца 12.000 Французаў перад 40.000 камуністых. Здабыцьцё гэтае крэпасьці перад Жэнэўскай канфэрэнцыяй або ў часе яе паставіла-б Захад, перадусім Францыю перад даканым фактам камуністычнай мілітарнай перавагі й абніжыла-б моцна аўтарытэт Захаду ў вачох азіяцкіх народаў. Ня гледзячы на геройскую абарону крэпасьці пад камандаваньнем генэрала дэ Кастрыса, вайсковыя спэцыялістыя ўважаюць, што ўпадак Дыен-Біен-Пгу зьяўляецца справай толькі нямногіх дзён.

Напярэдадні Жэнэўскай канфэрэнцыі Маленкаў сказаў вялікую «мірную» прамову, мэтай якой зьяўлялася бясспрэчна раззброіць заходнюю апінію, у першую чаргу францускую на карысьць савецкіх плянаў. Паводля свайго зьместу прапановы Маленкова не зьяўляюцца нечым новым. Яны зьмяшчаюць тое, што Масква паўтарае ўжо ад доўгага часу, калі ходзіць аб тое, каб маральна раззброіць Захад. Заходнія дзяржавы павінны прыняць у Атлянтычны пакт Савецкі Саюз і гэтым фактычна яго зьліквідаваць. Яны павінны вызнаць чырвоны Кітай за раўнапраўнага партнэра ўва ўсіх міжнародных арганізацыях і прыняць яго ў Задзіночаныя Нацыі, павінны ажывіць гандлёвыя дачынэньні зь дзяржавамі савецкага блёку, адмовіцца ад рэмілітарызацыі Нямеччыны й Японіі. За ўсё гэта Маленкаў запрапанаваў Захаду пустую й ня раз паўтараную яшчэ Сталінам фразу, што «камунізм і капіталізм могуць мірна між сабой існаваць» ды зрабіў выстрал пад адрасам Вялікабрытаніі й Францыі, што француска-савецкі й брытанска-савецкі саюзныя пакты зьяўляюцца падпісаныя крывёй і ня могуць быць разарваныя.

Гэтую прамову Маленкава дапоўніла маскоўская «Правда». Назваўшы ўдзел Кітаю ў Жэнэўскай канфэрэнцыі «вялікай перамогай лягеру міру», артыкул свой камуністычны афіцыёз канчае сказам «Хай жыве прыязьнь народаў Вялікабрытаніі, Задзіночаных Штатаў і Савецкага Саюзу». Што гэты сказ зьяўляецца танным прапагандовым трыкам, найлепей могуць сьветчыць падзеі ў Індакітаі, дзе камуністыя ў вапошнім часе ўзмоцнілі сваю афэнзыву.

Характэрным крокам Савецкага Саюзу былі дзьве ягоныя ноты, высланыя ў 24 гадзіны адна за другой урадам ЗША, Вялікабрытаніі й Францыі 21 красавіка з дамаганьнем разглядаць камуністычны Кітай на Жэнэўскай канфэрэнцыі як раўнапраўнага партнэра з чатырмя аста-

(Заканчэньне на 2-ой балоне)

# Удар па савецкім шпіянажы

Апошнімі тыднямі, якраз перад самай Жэнэўскай канфэрэнцыяй, на Захадзе былі раскрытыя вялікія сеткі савецкага шпіянажу, што моцна скампрамітавала Крэмль у вапініі Захаду, а таксама завастрыла ягоную пільнасьць.

Пачалося ў Аўстраліі. Тут 12 красавіка трэйці сакратар савецкай амбасады ў Камбэры, сталіцы Аўстраліі, Уладзімер Пятроў, які фактычна кіраваў усей савецкай разьведкай у гэтай краіне, зьявіўся перад аўстралійскімі ўладамі й папрасіў права азылю. Адначасна ён перадаў аўстралійскім уладам вельмі важны сакрэтны матарыял, які выяўляе цэлую сыстэму савецкага шпіянажу ў Аўстраліі. Пятроў падаў таксама шмат прозьвішчаў замешаных у гэтую работу людзей, сярод якіх нямала й Аўстралійцаў. Матарыялы, пераданыя Пятровам, выявіліся на столькі важнымі, што аўстралійскі прэм'ер Мэнзіс уважаў за патрэбнае склікаць таго-ж самага дня ў гэтай справе паседжаньне ўраду й паседжаньне парляманту. Парлямант дэў Пятрову права азылю бязь ніякіх засьцярогаў, а прэм'ер Мэнзіс запэўніў перад парлямантам, што пераданы Пятровам матарыял даводзіць, што была загрожаная бясьпека ўсей Аўстраліі. Адначасна была пакліканая надзвычайная каралеўская камісія дзеля дасьледваньня гэтых матарыялаў.

Хаця прэм'ер Мэнзіс не падаў істоты савецкай загрозы, пануе агульнае пераканаьне, што між іншым былі там пляны бамбардаваньня на выпадак вайны атамнымі бомбамі аўстралійскіх гарадоў. Гэтыя здагадкі выклікалі сярод аўстралійскага грамадзянства цэлую псыхозу панікі й страху. Характэрна, што савецкі амбасадар у Аўстраліі Генэралаў спачатку пусьціў вастку, што Пятроў ня перайшоў на бок Захаду, але быў Аўстралійцамі выкрадзены. Пазьней-жа сам сабе запярэчыў, калі абвінаваціў Пятрова ў дэфраўдацыі ў пасольстве вялікай сумы грошаў і зажадаў на гэтай падставе ягонай выдачы. Савецкі ўрад таксама войстра зарэагаваў на даньне Пятрову права азылю і зарваў дыпляматычныя дачыненьні з Аўстраліяй, а так-жа абвесьціў ёй гаспадарскі байкот. Дагэтуль, як ведама, Саветы закуплялі ў Аўстраліі вялікую колькасьць воўны для сваей індустрыі.

За некалькі дзён пазьней справу Пятрова прыцьміў у вапініі сьвету выпадак зь ягонай жонкай. На шпальтах усей заходняй прэсы паявіўся фотоздымак, як два «кур'еры» савецкай амбасады ў Канбэры сілай вядуць жонку Пятрова на лётнішча, адкуль адправілі яе ў Савецкі Саюз. Пятрова доўга хісталася, ці ехаць, ці таксама прасіць права азылю. Аднак аўстралійскія ўлады самі ёй запрапанавалі «выбраць свабоду». Калі самалёт па дарозе прызямліўся ў аўстралійскім порце Дарвін, зьявіліся да Пятровай прадстаўнікі ўладаў і запрапанавалі ёй права азылю і далі ёй магчымасьць гутарыць па тэлефоне з мужам. Савецкія «кур'еры» прабавалі перашкодзіць ім рэвальвэрамі, але былі разаружаныя. Таму некаторыя газэты пішуць, што «не Пятрова выбрала свабоду, але свабода выбрала Пятрову». Трэба з прыемнасьцю адцеміць, што гэтым сваім сьмелым крокам аўстралійскія ўлады выказалі максімум шляхотнасьці й спачуваньня да ахвяраў бальшавіцкага тэрору.

Другі падобны выпадак стаўся ў Заходняй Нямеччыне. 18 лютага сёлета здаўся Амэрыканцам у Франкфурце капітан савецкага МВД Хахлоў, які быў прысланы на асабісты загад шэфа МВД Круглова забіць расейскага эмігранта, кіраўніка сэкцыі расейскай арганізацыі НТС у Франкфурце Акаловіча. Хаця гэта сталася 18 лютага, але справа доўгі час была ў сакрэце і толькі нядаўна Хахлоў выступіў перад зарганізаванай амэрыканскімі ўладамі прэсавай канфэрэнцыяй у Франкфурце, на якой расказаў няверыгодныя рэвэляцыі. Хахлоў падчас апошняй вайны быў перакінуты праз фронт на Беларусь, дзе кіраваў савецкай партызанткай і, між іншым, зарганізаваў забойства генэральнага камісара Беларусі Вільгэльма Кубэ. У 1952 годзе МВД пастанавіла выслаць яго ў Францыю з мэтай забіць там аднаго эмігранта з за зялезнай заслоны. Тады капітан Хахлоў адмовіўся ад гэтай місіі, выясьняючы, што ён вычарпаны нэрвова й таму місія можа ня ўдацца, МВД гэтым разам паверыла. Але калі МВД загадала яму цяпер забіць у Нямеччыне Акаловіча, дык далей адмаўляцца раўнялася-б ягонаму здэмаскаваньню. Таму Хахлоў даў сваю згоду, але пад уплывам сваей жонкі, якая яму мела заявіць, што калі заб'е нявіннага чалавека, дык страціць назаўсёды яе й сваё дзіця, пастанавіў «выбраць свабоду». Таму 18 лютага ён зьявіўся на памешканьне Акаловіча ў Франкфурце і заявіў яму, што прысланы яго забіць, але гэтага ня зробіць, і папрасіў памагчы яму атрымаць права азылю. Забіць меўся із спэціяльнага рэвальвэра, якія Саветы цяпер прадукуюць спэцыяльна для мэтаў палітычных забойстваў на Захадзе. Ён мае форму мэталёвай скрынкі да папяросаў, выстрал адбываецца пры помачы электрычнай батарэі. Рэвальвэр гэты пры выстрале ня выдае амаль ніякага гуку, а кулі зьяўляюцца затрутымі, што сьмерць наступае на месцы.

Прэса на Захадзе ўважае Хахлова за найвялікшую здабычу, якая папала ў рукі Захаду пасьля апошняй вайны. Ён дакладна паінфармаваў Амэрыканцаў аб усіх зьменах у МВД і наагул у Саветах, якія наступілі ад часу сьмерці Сталіна й арышту Бэрыі. Ён таксама паінфарма-

(Заканчэньне на 2-ой балоне)

# Польскі вучоны аб гісторыі Беларусі

**Палякі, пішучы пра гістарычную Літву, або проста прысабечваюць Польшчы беларускую дзяржаўнасьць яе (Літвы), або пра беларускую дзяржаўнасьць яе можна чытаць у іх толькі паміж радкоў, у лепшым прыпадку прызнаюць толькі ў колькіх словах беларускую дзяржаўнасьць Вялікага Княства Літоўскага, прызнаюць так, што няўважныя чытачы могуць нат і не зацеміць гэтага. Інакш робіць Андрэй Вінцэнз, што бачым із ягонага артыкулу, надрукаванага ў часапісе «Культура» (вельмі паважны польскі месячнік, які выдаецца ў Парыжы) у нумары за сакавік сёлета. Перадрукоўваючы ніжэй гэты артыкул, даём ад сябе ў вынасках патрэбныя пасьяненьні.** **РЭДАКЦЫЯ**

✳

У Нью Ёрку тры гады выходзіць ворган Навуковага Таварыства Пранціша Скарыны, месячнік «Веда» пад рэдакцыяй Я. Станкевіча. Часапіс прысьвечаны галоўна гісторыі Беларусі і беларускай мове. Польскі чытач, узгадаваны на гісторыі Польшчы, так як яе вучылі ў польскіх школах, вельмі зьдзівіцца, чытаючы гэты часапіс. Прывык ён (польскі чытач — Рэд.) уважаць, што Вялікае Княства Літоўскае гэта Літва, а Літва гэта (як у Міцкевіча) — Польшча. А тут даведваецца, што Вялікае Княства Літоўскае мела **собскую культуру, культуру рускую,**[1]) значыцца беларускую, і што было яно запраўды дзяржавай беларускай. Вучылі нас гісторыі згодна з прынцыпам, што ўсё, што ёсьць польскае ў XIX стагодзьдзі, дык было польскім і ўперад[2]), што было таксама вялікім упрашчэньнем, як цьверджаньне расейскае, што тое, што ёсьць Расеяй у XIX ст., было ёю заўсёды (і прысабечаньне дзеля таго як Расейца Хмяльніцкага, Казаччыны і Кіеўскай Русі). А тымчасам, дарма што Вялікае Княства Літоўскае ня было Польшчай, яно было з Польшчай в уніі[3]) і тварыла разам зь ёй Рэчпаспалітую. Каб магчы чуцца спадкаемцам гэтае Рэчыпаспалітае, трэба каб штось ведаць пра партнэраў уніі. Колькі з нас (Палякоў — Рэд.) ведае, што ўрадавай моваю Вялікага Княства была мова русукая[4]) ня толькі за Ягайлы, але ў XVI ст. і да канца XVII ст. Што пачуцьцё літоўскае[5]) апрычонасьці было жывое ня толькі за Люблінскай Уніі, але й пасьлей, нат яшчэ ў часе паходу Наполеона на Маскву. І што «Ліцьвіны»[6]) ня чуліся **аўтаматычна** Палякамі, але сусобсьнікамі, а потым суспадкаемцамі Рэчыпаспалітае.

Польскі чытач таксама вельмі зьдзівіцца, а мо і ўсьміхнецца, бачучы, што часапіс мянуе гэткіх Ліцьвіноў, як Дамэйка або Касьцюшка, бачучы, што мова пра падзел **Беларусі** ў XVIII ст., пра **беларускія** паўстаньні і г. д. І падумае можа нат: ня маюць собскае гісторыі, дык прысабечваюць нашую. Але гэны (зрэшты гіпатэтычны) чытач ня будзе мець за сабой праўды. Паўстаньні былі запраўды таксама і літоўскія, значыцца галоўна беларускія[7]), а мінуўшчыня Вялікага Княства Літоўскага ёсьць мінуўшчыняй як Беларусі, так і Лятувы[8]). Было-б вузкім нацыяналізмам з нашага боку казаць, што Міцкевіч, Князьнін, Касьцюшка або Траўгут былі толькі Палякамі, а не таксама Ліцьвінамі-Беларусамі. Ды было-б гэта супярэчна зь гісторыяй. Трэ мо выказаць жаль, што «Веда» выходзіць (толькі) пабеларуску. Гэта не парадокс. Было-б бяссумлеву карысна, каб часапіс выходзіў і папольску, карысна нам, бо мы маглі-б з гэтага шмат навучыцца, карысна можа й Беларусам, бо-ж мы засуджаныя на суседзтва.

**Андрэй Вінцэнз**

---

[1]) Дзеля таго, што старабеларускую мову літаратурную Палякі звалі моваю «рускай» (Маскоўцы звалі яе «літоўскай»), дык А. Вінцэнз тут і даўнейшую культуру беларускую завець «рускай».

[2]) Няясна, што тут аўтар мае наўвеце. Што тычыцца беларускіх земляў, дык толькі Бела-Падляскі павет пасьля 1815 г. належаў **адміністрацыйна** да Польшчы. З гледзішча этнаграфічнага ўзноў ніякія землі беларускія ў XIX ст. ня былі польскімі.

[3]) Ад 1569 г.

[4]) Тут ізноў А. Вінцэнз, згодна з даўнейшай польскай тэрміналёгіяй, называе старабеларускую мову «рускай».

[5]) Як відаць ніжэй, пад «Ліцьвінамі» «літоўскі» аўтар разумее жыхароў Вялікага Княства Літоўскага ды галоўна Беларусаў.

[6]) Тут аўтар ясна паказвае, як ён разумее слова «Ліцьвін», «літоўскі».

[7]) У аўтара «Літвы».

## УЛАДЫКА ВАСІЛЬ — АРХІЯПІСКАПАМ

Пасьля Зьезду сьв. БАПЦарквы ў Аўстраліі, на просьбу сьвятарства й вернікаў, Яго Высокапраасьвяшчэнства Праасьвяшчэньнейшы Уладыка СЯРГЕЙ, Галава Сьвяшчэннага Сабору Япіскапаў БАПЦарквы, выдаў наступнае распараджэньне:

**«Распараджэньнем Яго Высокапраасьвяшчэнства Высокапраасьвяшчэньнейшага Архіяпіскапа Сяргея, Галавы Беларускае Аўтакефальнае Праваслаўнае Царквы, даводзіцца да ведама Яго Праасьвяшчэнству Праасьвяшчэньнейшаму Япіскапу Васілю Віленскаму, што за Вашую добрую Архіпастырскую дзейнасьць на карысьць Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы — Вы ўзнагароджаны санам АРХІЯПІСКАПА ВІЛЕНСКАГА (без нашэньня крыжыка на клабуку).**

**† Зьмірэнны Архіяпіскап Сяргей.**
**Сыднэй — Аўстралія**
**28-га сакавіка 1954 г.»**

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011



# Няўдалыя спробы ўратаваць АБН

Шэсьць год унікаў АБН скліканьня кангрэсу для правядзеньня прадугледжаных статутам гадавых выбараў усіх кіраўнічых ворганаў АБН. Унікаў іх таму, што пераважаючая бальшыня сяброў АБН не падзяляла ні датулешняй палітыкі й тактыкі кіраўніцтва, ні ягоных таталітарных і супрацьстатутовых дзеяньняў, ні практыкі праводжанага ім палітычнага блефу.

Звыш двух год бальшыня сяброў АБН намагалася прымусіць асталае і паводля свайго складу незаконнае кіраўніцтва склікаць кангрэс і, калі былі вычарпаныя ўсе сяродкі, не аставалася яму іншага выхаду, як пакінуць рады АБН і перад палітычнай грамадзкасьцю раскрыць увесь незавідны абраз нутранага палажэньня АБН, аб чым дастаткова потым паінфармавала ўся прэса.

І толькі пасьля адыходу бальшыні сяброў АБН прэзыдыюм АБН у «ўдарным парадку» пачаў прыгатаваньне да скліканьня кангрэсу, усімі спосабамі й сяродкамі намагаючыся паказаць навонкі, што ў АБН усё ў парадку, што ён, як і перад гэтым, зьяўляецца запраўдным выражэньнем імкненьняў паняволеных народаў і што ён яшчэ жыве... Амаль два месяцы прыгатаўляліся ўсе запляванаыя сп. Яраславам Стэцькам імпрэзы. Не шкадавалі ні грошаў, ні прапагандпай рэклямы, ні вэрбоўкі людзей, ні закліканьня ўсіх і кажнага на «вялікую маніфэстацыю АБН» у Мюнхэне й г. д.

Аднак ня толькі поўны нутраны развал АБН, аб якім гэтак многа пісала прэса, прымусіў абэнаўскіх таталітарыстых пасьпешна схапіцца за скліканьне кангрэсу АБН і аранжаваньне шуму вакол яго, але таксама ў немалой ступені і падзеі ў радох Замежных Часьцінаў Арганізацыі Украінскіх Нацыяналістых — ЗЧ ОУН — законнае кіраўніцтва якіх афіцыяльна паведаміла, што сп. Я. Стэцька не зьяўляецца больш прадстаўніком Украінцаў у АБН і што яно таксама стаіць на базе поўнай дэмакратызацыі радоў ЗЧ ОУН, на што налягае і галоўнае кіраўніцтва ОУН на Украіне. Супраць такога дамаганьня паўстаў С. Бандэра і Я. Стэцька, якія сваімі дзеяньнямі ўнесьлі развал унутры ОУН. Я. Стэцьку неабходным цяпер было скліканьне кангрэсу АБН у якасьці аднаго із спосабаў адвярнуць увагу украінскіх нацыяналістых ад нутраных кампліка цыяў, а эфэкт скліканага кангрэсу АБН выкарыстаць, як ён ужо ня раз у сваей практыцы выкарыстоўваў, для сваіх нутраных мэтаў сярод ОУН.

Усе гэтыя меркаваньні змушалі ня толькі сп. Я. Стэцьку, але і ўвесь вялікі склад ягоных апаратчыкаў, натужыць усе свае сілы на тое, каб абавязкава забясьпечыць пасьпех кангрэсу АБН. Але ўсе гэтыя натугі аказаліся дарэмнымі: і маніфэстацыя АБН, і яго кангрэс, і прэс-канфэрэнцыя закончыліся, фактычна, яўным правалам, аб чым ні АБН, ні Я. Стэцька, ясна, не пахваляцца...

На маніфэстацыі АБН у Мюнхэне 27 сакавіка сёлета прысутнічала ўсяго толькі 200 чалавек, сярод якіх ня менш траціны былі людзі, якія з АБН ня маюць зусім нічога супольнага і прыйшлі туды дзеля простай цікавасьці, каб быць сьветкамі правалу маніфэстацыі. Заля каталіцкага дому моладзі «Кольпінгсгайм», якая зьмяшчае 700 чалавек, была на столькі пустой, што арганізатарам маніфэстацыі нічога іншага не аставалася, як зусім закрыць уваход на балькон, разьлічаны на 350 чалавек, і ўсіх сабраных разьмясьціць на партэры, дзе пярэднія й заднія рады залі зусім пуставалі. Адсутнасьць публікі на доўга зацягнула адкрыцьцё маніфэстацыі. Надчэквалі, быць можа, хто-небудзь яшчэ прыйдзе із спазьненьнем.

Шэсьць вялікіх сталоў, прысьвечаных для прадстаўнікоў прэсы, таксама былі зусім пустыя. Нікога не аказалася ў залі ні ад афіцыйных нямецкіх або амэрыканскіх установаў, нікога ня было ні ад грамадзка-палітычных арганізацыяў ня толькі нямецкіх, але навет і эміграцыйных. Не дарма адзін із знаёмых мне Немцаў заявіў: «Якая дзіўная й камічная публіка. Проста кідаецца ў вочы „унтэрдурхшнітліхэс публікум"...»

Яўная няўдача падзеіла і на лідэраў АБН, якія былі вельмі нэрвовыя, бегалі па залі, хапалі адзін другога за полы, штосьці даводзячы адзін аднаму. Гэтая нэрвовасьць выявілася і ўва ўсіх выступленьнях аратараў, прамовы якіх вызначаліся зьдзіўляючай шаблённасьцю і шэрасьцю. Пры чым, кажнаму кідалася ў вочы, што галоўны ўдар, галоўнай мэтай дэманстрацыі зьяўлялася ня столькі выступленьне супраць бальшавізму, супраць яго таталітарна-дэспатычнай сыстэмы паняволеньня, але галоўным чынам супраць Захаду, супраць заходняй дэмакрацыі, супраць заходняй прэсы й радыяперадачаў.

Асабліва ў гэтых выпадках вырозьніваліся сп. Н. Накашыдзэ (Грузін) і Д. Вальчэў (Баўгар). Першы з уласьцівай яму абыякавасьцю сказаў, што «мы абэнаўцы ня толькі змагаемся супраць расейскага бальшавізму, але так-жа й супраць расейскага народу, як такога. Мы бескампрамісныя антырасейцы...», што выклікала бурныя апладысмэнты з боку прэзыдыюму, у якім сядзелі прадстаўнікі новых арганізацыяў: харвацкіх усташаўцаў Антэ Павэліча, беларускіх зарубежнікаў Р. Астроўскага, казацкай групы І. Білага, якія якраз гарманізуюць із сугучнымі зь імі таталітарнымі групамі, што асталіся ў АБН.

Тыя, што разыходзіліся з маніфэстацыі, успаміналі часы масавых, узапраўды вялізарных выступленьняў АБН і параўноўвалі іх зь незавіднымі рэзультатамі апошняга, якое паказала, што АБН пасьля выхаду бальшыні ягоных сяброў згубіў сваю сувязь з масамі эміграцыяў, згубіў і падтрыманьне замежнай прэсы і няўхільна йдзе да свайго нямінучага канца поўнага развалу. З прыбітым настроем пакідалі маніфэстацыю і яе арганізатары, перакананыя ў яе правале.

Пад прэсіяй няўдачы маніфэстацыі сабраўся сам кангрэс АБН, які распачаўся толькі пасьля 10-ай гадзіны раніцы ў нядзелю 28 сакавіка сёлета ў готэлі «Вольф». Туркестанцы й часьць мадзярскай і баўгарскай дэлегацыяў станоўча дамагаліся абмеркаваньня прычынаў выступленьня бальшыні арганізацыяў з АБН, настойваючы на неабходнасьці знайсьці зь імі які-небудзь кампраміс, пайсьці ім на ўступкі, бо інакш АБН узапраўды пагражае нямінучая палітычная сьмерць, чаму ўчарашняя маніфэстацыя сваей поўнай няўдачай была жахлівай перасьцярогай. Супраць такой «гэрэзіі» й нарушэньня паслухмянасьці сп. Я. Стэцьку выступілі Н. Накашыдзе, Дурчанскі (Славак) і «даверaны ў справах Я. Стэцькі» Украінец Бэнцэль. Больш за ўсіх пры гэтым вырозьніваўся сваей «вернасьцю» Н. Накашыдзэ. Прыходзілася ня раз із за немагчымасьці дасягнуць адназгоднасьці перарываць паседжаньні кангрэсу.

Пасьля аднаго зь перарываў туркестанская дэлегацыя, абмеркаваўшы заіснаваўшую сытуацыю, знайшла для сябе немагчымым далейшае прабываньне ў радох АБН і дэманстрацыйна пакінула кангрэс, заявіўшы аб сваім выхадзе з арганізацыі. Гэта ашаламіла ўсіх прысутных. Я. Стэцька і Ф. Дурчанскі пабеглі ўсьлед за выходзіўшымі Туркестанцамі і пачалі малельным тонам прасіць іх не пакідаць АБН. Але Туркестанцы ім у гэтым станоўча адмовілі, заявіўшы, што далейшае іх прабываньне ў радох АБН прынясе вялікую шкоду й самой туркестанскай справе, асабліва сярод вонкавага сьвету.

За Туркестанцамі пайшла часьць і мадзярскай дэлегацыі з фракцыі праф. др. Хэндэля і часьць дэлегацыі баўгарскай. Настаў пасьля гэтага цяжкі прыгнятаючы мамэнт, пасьля чаго ўзноў і ўзноў выступаў Н. Накашыдзэ, дэмагагічна выкрыкваючы: «І калі навет увесь сьвет будзе супраць нас, мы будзем верныя нашаму спадару прэзыдэнту Стэцьку да канца. Мы ня прызнаём і паведамленьня самых Украінцаў аб тым, што ён не зьяўляецца больш іхным прадстаўніком у АБН. Мы хочам і будзем яго бачыць на чале нас!»

Незавіднае палажэньне было пры гэтым усіх тых, хто быў запрошаны быць у ролі нямых статыстых: харвацкіх усташаўцаў, прыхільнікаў Астроўскага, самазванага інтэрнаванага ў Альжыры атамана І. Білага і іншых, якія ня ведалі, што ім рабіць...

Толькі пасьля абеду кангрэс змог перайсьці да парадку дня. Здавалася, што за шэсьць год дзейнасьці АБН дастаткова было справаў, зь якіх трэба было-б здаць справаздачу, шмат пытаньняў, якія мусіў-бы абмеркаваць кангрэс. Усё гэта было змазана і да 2-ой гадзіны дня былі выслуханыя й справаздачы ворганаў, зьменены статут АБН і выбраныя яго новыя ворганы. Шыбкасьць, якой мог-бы пазавідаваць і нябожчык Сталін пры скліканьнях ім сваіх партыйных і дзяржаўных інстанцыяў.

Статут АБН быў зьменены так, каб болей не магла паўтарыцца «дэмакратычная рэвалюцыя», каб ніхто ня важыўся болей гаварыць аб «дэмакратычных прынцыпах», аб «бальшыні» — уся паўніня ўлады была перададзеная прэзыдыюму, падобна практыцы КП СССР, а ЦК АБН быў зьведзены да ролі рэгістратара волі і пастановаў Я. Стэцькі і ягоных апаратчыкаў.

Як і трэба было чакаць, старшынёю прэзыдыюму АБН астаўся нязьменны й «незаменны» Я. Стэцька, ягоным заступнікам ген. Фаркаш (Мадзяр), другім заступнікам Баўгар Крысто Стацеў. Трэйці заступнік ня быў выбраны. Гэтае месца

(Заканчэньне на 3-ай балоне)

# Удар па савецкім шпіянажы

(Заканчэньне з 1-ай балоны)

ваў аб дэталях замардаваньня Троцкага й выкрадзеньні ў Парыжы ў 1930 г. ген. Куцепава. Ягоныя паказаньні датычаць дэталяў арганізацыі сетак МВД у Заходняй Нямеччыне й Аўстрыі.

У сувязі із справай Хахлова амэрыканскі ўрад выслаў 23 красавіка войстры пратэст Савецкаму Саюзу, абвінавачуючы яго ў высыланьні ў Заходнюю Нямеччыну забойцаў і ў выкраданьні людзей.

Рэвэляцыі Хахлова прывялі да вялікіх арыштаў савецкіх агентаў у многіх заходніх краінах і ў Нямеччыне. Аб гэтым паінфармавалі аўтарытэтныя колы ў сталіцы Заходняй Нямеччыны Бон і заявілі, што трэба спадзявацца далейшых арыштаў. На думку альянцкай разьведкі, Савецкі Саюз будзе цяпер змушаны поўнасьцю зрэарганізаваць свой шпіёнскі й дывэрсійны апарат у Заходняй Нямеччыне і Аўстрыі.

Некаторыя палітычныя колы прыпушчаюць, што пасьля распачацьця Жэнэўскай канфэрэнцыі будзе апублікаваная новая вялікая савецкая афэра, якая мела месца ў Японіі. Адзін із сакратароў савецкай місіі ў Японіі Раставораў у канцы студзеня сёлета быў раптам згінуў ў Токіё. Тымчасам выясьнілася, што Раставораў быў кіраўніком савецкай шпіёнскай сеткі і сабатажу ў Японіі, значыцца, адыгрываў тую самую ролю, што й Пятроў у Аўстраліі. Цяпер разышліся весткі, што ён перайшоў да Амэрыканцаў і знаходзіцца пад іхнай апекай.

Шпіёнская й дывэрсійная афэра з Пятровам і Хахловам, якія сталіся ведамымі амаль адначасна, наяўна паказваюць, на колькі савецкім шпіянажам і дывэрсіяй падмінаваны ўвесь заходні сьвет. Гэта яшчэ адзін аргумэнт за тым, што нейкае супрацоўніцтва зь міжнародным камунізмам, ані таксама надзея, што спрэчныя праблемы з Савецкім Саюзам могуць быць разьвязаныя мірным спосабам шляхам дыпляматычных дагавораў, зьяўляюцца наіўным самаабманам. Савецкі Саюз і ўвесь міжнародны камунізм, што зьяўляецца на ягоных услугах, маюць перад сабою адну мэту: апанаваць увесь сьвет, зьнішчыць свабоду й хрысьціянскую цывілізацыю.

У гэтым артыкуле падалі чыста інфармацыйныя дадзеныя аб афэрах Пятрова й Хахлова, зазначаючы, што магчыма яшчэ дадзём да гэтага свае камэнтары. Справа ў тым, што паколькі афэра Пятрова ясная й ніякія задніх думак ня можа выклікаць, дык справа Хахлова хавае у сабе шмат няверыгоднага.

(-іч)

# Пачалася Жэнэўская канфэрэнцыя

(Заканчэньне з 5-ай балоны)

лымі вялікадзяржавамі. Ясна, што заходнія дзяржавы гэтую ноту адкінулі. У выпадку вызнаньня камуністычнага Кітаю за раўнапраўнага партнэра, ягоная дэлегацыя ў Жэнэве атрымала-б права старшынства на ёй па чарзе. Хоця гэтага пытаньня Молатаў з парадку дня ня зьняў і яно яшчэ можа быць актуальным, аднак справа старшынства была пакуль што палагоджана кампрамісова: пакуль будуць адбывацца нарады ў справе Карэі, старшынстваваць будуць па чарзе міністар замежных справаў Сыяму, савецкі міністар Молатаў і брытанскі міністар Ідэн. Калі-ж канфэрэнцыя пяройдзе да індакітайскай праблемы, тады справа старшынства будзе паднятая нанава, так як склад канфэрэнцыі будзе іншы.

У мамэнт, калі пішуцца гэтыя радкі, сталіся ўжо ведамыя дамаганьні ў справе Карэі камуністых і заходніх дзяржаваў. 27 красавіка міністар замежных справаў Паўночнай Карэі запрапанаваў разьвязаньне карэйскага пытаньня шляхам правядзеньня агульнакарэйскіх выбараў і стварэньня часовага агульнакарэйскага ўраду з прадстаўнікоў урадаў Паўночнай Карэі і Паўдзённай Карэі. Як бачым, камуністычныя дамаганьні ў справе Карэі зусім ідэнтычныя з дамаганьняні Молатава, якія ён высунуў на Бэрлінскай канфэрэнцыі ў справе Нямеччыны. Такое разьвязаньне карэйскага пытаньня было-б першым крокам для камунізацыі ўсяе Карэі. Дык зусім зразумела, што заходнія дзяржавы гэты праект адкінулі і высунулі праект собскі. Амэрыканскі міністар замежных справаў Дальлес запрапанаваў, як разьвязаньне карэйскае праблемы, прыняць пастанову ў гэтай справе пленарнага паседжаньня Задзіночаных Нацыяў з 7 кастрычніка 1950 году. Гэтая пастанова прадбачыць камісію Задзіночаных Нацыяў, якая мела-б за заданьне правядзеньне задзіночаньня Карэі і нагляд за агульнакарэйскімі выбарамі.

Вельмі наіўным было-б спадзявацца, што на гэтай канфэрэнцыі будзе пазытыўна палагоджаная справа Карэі. Камуністыя, ясна, ня згодзяцца на праект заходні, бо ведаюць, што тады прышлося-б ім разьвітацца і з Паўночнай Карэяй, а заходнія дзяржавы ня змогуць прыняць камуністычнага праекту. Астанецца тады адзінае, як найлепшае з усіх магчымых, разьвязаньне — гэта угрунтаваць падзел Карэі на паўночную камуністычную і паўдзённую дэмакратычную, іншымі словамі прыняць такую разьвязку, як і ў нямецкім пытаньні. Але паміж Паўдзённай Карэяй і Заходняй Нямеччынай існуе вялікая розьніца. У той час, калі Заходняя Нямеччына зьяўляецца зусім няўзброенай, дык Паўдзённая Карэя мае вялікую й добра вышкаленую армію й заяўляе, што ў выпадку няўдачы канфэрэнцыі яна будзе наважаная правесьці задзіночаньне краіны збройнымі сіламі. Таму карэйская праблема можа хаваць у сабе яшчэ многія неспадзеўкі.

Індакітайскае пытаньне зьяўляецца яшчэ цяжэйшае за карэйскае. У Карэі як-ні-як існуе перамір'е і краіна падзеленая на дзьве выразна адмежаваныя дзяржавы. У Індакітаі, дзе апошнім часам баі набралі найбольшай ад пачатку вайны зацятасьці, фронту фактычна ня існуе. Тут проста нельга было-б устанавіць дэмаркацыйнай лініі паводля стану фронту, бо ўзаемна праціўныя сілы зьяўляюцца перамешаныя. Французы й войскі Ветнаму фактычна пануюць толькі над гарадамі й апорнымі пунктамі, кантралююць важнейшыя камунікацыйныя лініі, і то толькі днём, тады калі ноччу зьяўляюцца там поўнымі ўладарамі камуністычныя паўстанцы.

Вынікаў канфэрэнцыі ў справе Індакітаю прадбачыць сяньня ніяк нельга. Адно можна прыпушчаць, што камуністыя, у дадзеным прыпадку камуністычны Кітай, будзе баяцца рызыкаваць вайны з Амэрыкай, якая нядвузначна загразіла сваей інтэрвэнцыяй у індакітайскай вайне ў выпадку, калі ня будзе знойдзены іншы шлях спыненьня канфлікту. У кажным выпадку, здаецца, пройдзе яшчэ ня мала тыдняў, пакуль гэтае пытаньне знойдзецца на парадку дня. Як паведаміла прэса, савецкая й кітайская дэлегацыі закантрактавалі для сябе ў Жэнэве вілі на цэлых 6 месяцаў. Значыцца, ня прыпушчаюць, што канфэрэнцыя гэтая скончыцца раней.

**Язэп Каранеўскі**

# Аб акадэмічнай свабодзе у СССР

**(ПРЭСАВЫ КАМУНІКАТ АМЭРЫКАНСКАГА КАМІТЭТУ ВЫЗВАЛЕНЬНЯ АД БАЛЬШАВІЗМУ)**

Свацкі ўрад больш жорстка здушвае свабоду навуковага творства, чымся гэта было навет у часы сярэднявечча, — заявіў А. Філіпаў, былы прафэсар аднаго з унівэрсытэтаў у СССР, у сваім уступным дакладзе на канфэрэнцыі аб пытаньнях акадэмічнай свабоды ў СССР, скліканай 3 і 4 красавіка ў Нью Ёрку, пры ўдзеле былых савецкіх вучоных.

На трох паседжаньнях у суботу й нядзелю, прысьвечаных пытаньням аб прычынах і мэтадах здушэньня акадэмічнай свабоды ў СССР, пабывала звыш 350 чалавек, улічваючы дакладчыкаў і публіку. Былі прачытаныя кароткія рэфэраты амаль з усіх галінаў навукі, уключаючы становішча літаратуразнаўства ў розных саюзных рэспубліках. Вынік усіх дакладаў зводзіўся да таго, што аб акадэмічнай свабодзе ў СССР нельга й думаць таму, што яна зьяўляецца загрозай бальшавіцкай тэорыі й практыцы.

У сваім рэфэраце аб дыялектычным матарыялізьме ў галіне сьціслых навукаў Сьцяпан Раманаў паказаў, што кажная спроба савецкіх вучоных разьвязаць узьнікаючыя ў навуковай працы пытаньні напатыкаецца на нязвычайна моцны супраціў з боку партыйнай філязофіі. Ніводзін вучоны ня можа заўсёды ўсьпець за лініяй дырэктываў бальшавіцкай партыі, якая ўсьцяж зьмяняецца, і дзеля гэтага для яго адкрыты толькі адзін шлях: прылучыцца да сваіх сяброў у «змове маўчаньня». У тых-жа выпадках, калі вучоным прыходзіцца высказваць свае думкі, яны стараюцца паслугоўвацца тэхнічнай мовай у надзеі абмануць камуністычных партыйных начальнікаў. На думку былага савецкага інжынера-электрыка Эдварда Касьяна, ведамыя дасягненьні савецкіх вучоных і інжынераў у радзе галінаў выясьняюцца тым, што савецкі ўрад падтрымлівае падобную работу з гледзішча на яе патэнцыяльнае значэньне для ваенных патрэбаў.

Прафэсар Міхайла Ветухіў прадбачыць, што нядаўныя напады супраць Лысенкі прывядуць да перагляду ўсіх прынцыповых асноваў савецкай гэнэтыкі. Прафэсар Ветухіў заявіў, што, згодна з тэзамі марксізму-ленінізму, кажная стадыя разьвіцьця прыводзіць да новых формаў і зьместу вымаганьняў камуністычных верхаводаў. Пры такіх умовах свабода думкі й акадэмічнай дзейнасьці ня могуць існаваць.

Як стаіць справа з псыхіятрыяй? У сваім рэфэраце праф. М. Мішчэнка вельмі ясна паказаў, што страх за собскае жыцьцё, пагроза арышту і канцэнтрацыйных лягераў, разьвіцьцё праступнасьці сярод малалетніх, перанасяленьне гарадоў, — усё гэта штучна стварае траўматычныя фактары, якія разбураюць, у сваю чаргу, псыхіку сярэдняга савецкага чалавека. І ўсё-ж урад робіць вельмі мала для направы гэтага становішча. Замест гэтага партыя толькі заўсёды ўмешваецца як у тэарэтычнае разьвіцьцё псыхіятрыі, так і ў галіну чыста практычнага прытарнаваньня гэтай навукі.

Паводля словаў праф. І. Замшы самадумства партыйных правадыроў у галіне эканомікі дасягнула свайго зэніту ў 1935 годзе, калі Мікаян заявіў: «Эканамістыя мне непатрэбныя, я сам эканамісты». З таго часу сытуацыя мала зьмянілася, як паказваюць напады некалькі год таму назад на ведамага эканамістага Варгу за тое, што ён адважыўся сумлявацца аб няўхільнасьці пасьляваеннага эканамічнага крызісу ў ЗША.

Праф. А. Аглоблін паказаў у сваім рэфэраце, наскольки абмежаваны савецкі гісторык ня толькі ў выбары тэмы дасьледваньня, але так-жа й жаролаў для сваей працы. Яму прыходзіцца працаваць пры адсутнасьці свабоды абмеркаваньня й крытыкі. Стыль ягоных разважаньняў ліхарадкавы, а калі яму і ўдаецца дабіцца апублікаваньня ягонае працы, дык рэдакцыйныя папраўкі зьмяняюць яе да непазнаньня. Ён ня толькі ня можа свабодна выразіць сваей думкі, але таксама пазбаўлены магчымасьці маўчаць.

У расейскай клясычнай літаратуры, — сказаў праф. Домгер — савецкія выданьні паддалі чыстцы ўсе нявыгадныя для ўлады ідэі. Выдаюцца, напрыклад, аднатомныя зборнікі твораў Дастаеўскага, але за ўсе 36 год савецкага панаваньня выданьне поўнага збору твораў Дастаеўскага было прадпрынятае толькі ў бязбунтоўную эпоху дваццатых гадоў, але й гэтае выданьне ня было закончаным. Калі-б савецкім літаратуразнаўцам была дадзеная магчымасьць выкарыстаць сабраны імі матарыял, — заявіў праф. Г. Глінка — дык савецкія спэцыялістыя расейскай літаратуры паказалі-б, на што яны ўзапраўды здольныя. Але такія магчымасьці ім ніколі не даюцца, найвыжэй толькі для мэтаў прапатанды.

Паводля словаў эмігрантаў-вучоных, з трыццатых гадоў вывучэньне культуры й літаратуры народаў СССР безьперапынна дэградуе. Праф. П. Каваліў цьвердзіў, што расейская мова штучна абвешчаная «ключом да пазнаньня камунізму». Гэтым тлумачыцца варожае дачыненьне бальшавікоў да вывучэньня нацыянальнай украінскай, беларускай, армянскай, грузінскай і цюрка-татарскай літаратуры. Пётр Адарчэнка гаварыў у сваім рэфэраце, што працы ўкраінскіх літаратуразнаўцаў адлюстроўваюць поўнае падпарадкаваньне партыйнаму заказу, які ўключае ў сябе русыфікацыю й распальваньне ненавісьці да Амэрыкі.

Закрануўшы пытаньні армянскай літаратуры, Сьцяпан Ховян прывёў цытаты з прамовы новага сакратара ЦК КП Армэніі Тоўмасяна, у якой апошні выражае свой жаль з прычыны адсутнасьці добрых раманаў, апавяданьняў і таленавітых п'есаў у савецкай Армэніі. Сучасныя армянскія пісьменьнікі, заявіў Ховян, ня могуць разьвівацца пад ціскам савецкай цэнзуры.

Галоўны рэфэрэнт у галіне геаграфічных навукаў, праф. Г. Таскін, гэтак нарысаваў абраз акадэмічнага жыцьця ў СССР: »У савецкіх вучоных няма выбару: або яны павінны лгаць самым бессаромным спосабам, або хаваць забойчую для рэжыму праўду... Праўда здэмаскавала-б усе створаныя савецкім урадам і кампартыяй міты. Таму, каб схаваць ад народу праўду, усе думаючыя слаі насельніцтва павінны быць пазбаўленыя магчымасьці выказваць свае думкі. Вось чаму ў СССР няма акадэмічнай свабоды».

Старшынствавалі на канфэрэнцыі выдатныя амэрыканскія дасьледавальнікі СССР: праф. Філіп Мозьлі, дырэктар Расейскага інстытуту пры Калюмбійскім унівэрсытэце; праф. Фрыдэрык Баргорн, прафэсар палітычнай эканоміі пры Ельскім унівэрсытэце; др. Джордж Клейн, ад філязафічнага факультэту Калюмбійскага ўнівэрсытэту. Сярод амэрыканскіх рэфэрэнтаў былі- др. Джон Рэшэтэр з Прынстонскага ўнівэрсытэту, праф. Н. Цімашаў ад Фордамскага ўнівэрсытэту і др. Раймонд Баўэр з Расейскага Дасьледавальнага Інстытуту пры Гарвардзкім унівэрсытэце.

Апрача гэтага з дакладамі выступілі: праф. Н. Кубанскі аб геалэгіі й геахіміі, праф. В. Грышко аб праве, праф. А. Адамовіч аб беларускай літаратуры, А. Цомая аб грузінскай літаратуры і Гамід-Рашыд аб цюрска-татарскай літаратуры.

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011



# «Пяяць для Бацькаўшчыны»

У пакоі цёпла. Пад электрычнай лямпай сінімі палосамі ўецца цыгаркавы дым. Сваясаблівая атмасфэра: стома з прыемнай прымешкай сьведамасьці праробленай працы. Канцэрты ўжо за плячыма, але-ж толькі сяньня нядаўна вярнуліся зы студыі, пакінуўшы там даўгую насьпяваную стужку.

За апошнія тыдні ўжо ўвайшло ў правіла, што пасьля выступаў усе нашы тры grandi artisti (гэтак мы іх ахрысьцілі), як і арганізатары зьбіраліся заўсёды ў пакоі спадароў Конюха й Карповіча — пагутарыць, а хіба найбольш паслухаць «перастрэлку» гэтых двух апошніх. Падсякалі яны адзін другога зь нябывалым артызмам. Прыкладам, падлавіўшы мамэнт, пусьціў кампазытар нейкае колкае слова. Сьпявак навет вухам не павёў: узяўшы колькі акордаў на гітары (ён-жа і гітарысты!), з усім магчымым лірызмам завёў ён песьню-раманс аб скочцы, што пражывала ў Менску на сьпіне кампазытара, ды аб тым, як і тая пакінула яго па яго беднасьці... Іншы раз і словам умеў ён дагадзіць кампазытару, ці й нашаму дырыгенту, сп. Кісламу. І ўсё гэта зраўнаважана, паважна.

Тое-ж было і ў гэны вечар. Толькі я неспакойна круціўся на крэсьле, бо паставіў сабе нялёгкую місію: выцягнуць зь сьпевака хоць колькі словаў аб сабе. Здавалася-б, справа ня так цяжкая для ягонага земляка, а навет сябры. Але той, хто ўжо меў гонар пазнаць Пётру Конюха, зразумее мяне. Ён рад гаварыць аб кажным, не шкадуе пахвалаў нікому. Але толькі калі хто заікаўся аб парэбе паданьня колькіх дэталяў ягонага жыцьця ў прэсу, аб папулярызаваньні ягонага імя, ён толькі махаў рукой:

— Браткі вы мае, — гаварыў ён зь нясхоўным наваградзкім акцэнтам, — нашто гэта патрэбна? Запяю — хай слухаюць, ды па гэтым і судзяць...

Сьціпласьць бяссумлеўная. Але ў гэтай сьціпласьці ня цяжка было вычуць і спакойную самаўпэўненасьць.

Беларускаму грамадзтву на эміграцыі — прыйдзе час — на Бацькаўшчыне — няраз давядзецца яшчэ чуць ня толькі аб Конюху, але напэўна і Конюха самога. Таму не зашкодзіць падзяліцца з чытачамі тымі скупымі дадзенымі, якія ў той вечар, усімі магчымымі спосабамі, мне ўсё-ж удалося вырваць.

— Маленства? Што радзіўся ў Наваградчыне, аб гэтым ведаеш. У 1910 годзе. Змалку пасьвіў каровы. Не свае — чужыя... — тут-жа пасьпяшаўся ён дадаць. — Трэба сказаць, што ўся сям'я была музыкальнай. Калі ў жніво, бывала, зацягнем песьню, усё поле пераставала працаваць. Летам даводзілася мне часта вадзіць коні на папас далёка за вёску — якіх 4 кілямэтры. Рабіць няма чаго, дык я пяю. А назаўтра бацькі расказваюць мне, што ўся вёска да поўначы прасядзела на прызьбе, слухаючы... — Але гэтага толькі ня пішы — выглядае на самахвальства.

Усе пераглянуліся. Пасьля майго ўрачыстага запэўненьня, што навет і ня думаю пісаць аб такіх дробязях, ён працягваў:

— Ужо ў юнацкія гады пачуў нястрымны пацяг...

— Да дзяўчат, — пасьпеў аўтарытэтна ўставіць сп. Карповіч, бліскаючы акулярамі. Наш Пётра толькі грозна ўставіўся на яго.

Пётра Конюх

— ...пачуў пацяг да музыкі. У 16 гадоў меў нагоду ўступіць у аркестру. Граў на карнэце. Гэта й было першым пачаткам мае музычнае асьветы. Калі апынуўся ў войску, прынялі мяне ў палкавую аркестру. Больш за год гралі мы ў тэатры ў Быдгашчы. Вярнуўшыся да хаты, дырыгаваў духавой і струннай аркестрай. А часта зьбіраліся на вёсцы, каб проста папяяць. — Тут ён усьміхнуўся. — Колькі разоў даводзілася пасядзець у гміннай «кутузцы» за беларускія песьні...

— Прыйшла вайна. У 1941 годзе апынуўся ў глыбі Савецкага Саюзу. Тут шмат расказваць не даводзіцца — гэты шлях прайшлі тысячы. Удалося папасьці ў арганізаваны Андэрсам корпус. Пасьля — Іран, Ірак, Палестына, Эгіпт... Урэшце — Італія. Пад Монтэ Касыно мне ўдалося — ледзь-ледзь не палажыў там галавы...

— Папасьці на студыі памог мне выпадак. Аднаго разу ведамыя італьянскія артыстыя песьні (Neri й іншыя) выпадкова пачулі мой голас. Не чакаючы, яны пайшлі да Андэрса з просьбай пусьціць мяне на пробу ў Рымскі Teatro Reale. Доўга чакаць не давялося. Я дасюль яшчэ захоўваю пасьветку з Teatro Reale, што гэткага галасавога матар'ялу яны яшчэ ня чулі. Пасьля гэтага стыпэндыю атрымаць было ўжо ня цяжка. Праляцела пяць год. Тут надарылася нагода выступіць як Беларусу ў конкурсе песьні, дзе брала ўдзел 13 нацыянальнасьцяў. Я ўзяў другое месца. І вось, за «беларускасьць» выступу я згубіў стыпэндыю — «суседзі» пастараліся. Давялося прабівацца самому — цяжка было... Адна лекцыя ў прафэсара каштавала тысячы ліраў. Зарабляў, даваў лекцыі, але навукі ня кідаў. Урэшце, 27 лютага 1951 году я атрымаў дыплём з Academia Mondiale degli Artisti

(Заканчэньне на 4-ай балоне)

# Няудалыя спробы ўратаваць АБН

(Заканчэньне з 2-ой балоны)

Стэцька зарэзэрваваў для Вэлі Каюм Хана, калі яму ўдасца намовіць Туркестанцаў вярнуцца ў АБН, на што, аднак, няма ніякай, здаецца, надзеі.

Генэральным сакратаром «за асаблівыя заслугі й праяўленую вернасьць» аказаўся Н. Накашыдзэ. Гэта выклікала незадаваленьне й нэрвовы прыпадак у папярэдняга зброяносца на гэтым становішчы др. Цтыбара Пакорнага (Славак), які горка жаліўся на чорную няўдзячнасьць з боку Я. Стэцькі, паказваючы на тое, што фактычна ягоны «канкурэнт» Накашыдзэ, як ня рэпрэзэнтуючы сабою ніякай грузінскай арганізацыі і належачы да АБН усяго толькі ў якасьці абсэрватара, ня можа быць генэральным сакратаром АБН. Але гэта не памагло, як не памаглі й іншыя «аргумэнты», што Накашыдзэ быццам двойчы быў затрыманы ў мінулым годзе швайцарскай паліцыяй і высланы із Швайцарыі за падазрэньне ў сувязі з савецкімі агентамі і што такія абвінавачаньні быццам былі таксама й з боку Немцаў, што не дазволіла Я. Стэцьку ўзяць яго з сабой восеньню мінулага году на прэсканфэрэнцыю ў Бон. ... Карацей, Н. Накашыдзэ аказаўся больш гібкім, чымся таксама гібкі Ц. Пакорны.

Старшынёю Рады Нацыянальнасьцяў стаўся др. Дурчанскі, ягоным заступнікам наш Астроўскі і ген. Прхаля (Чэх), але апошні паведаміў, што ён не даваў на гэта сваей згоды, зьдзіўлены тым, што да выхаду з АБН чэскай групы дэмакратаў-фэдэралістых В. Пекельскага — праф. Вірэра яго ў АБН ня прыймалі, а пасьля выхаду чэскай групы аказаўся і ён добрым...

Прыгнятаючае ўражаньне выклікаў на ўсіх апошні кангрэс АБН. Зь цяжкімі й цёмнымі думкамі пакідалі яго апошнія ўдзельнікі. Не разьвеілі гэтых думак і сумляваньняў навет і дэмагагічныя, крыклівыя заклікі і ружовыя пэрспэктывы Накашыдзэ. Цяжкім каменем лёг гэты кангрэс АБН на ўсіх...

У панядзелак 29 сакавіка ў 3 гадзіны па абедзе адбылася прэсканфэрэнцыя АБН, на якую былі запрошаныя ўсе акрэдытаваныя ў Мюнхэне замежныя карэспандэнты, нямецкія й эміграцкія журналістыя і карэспандэнты. І тут узноў было глыбокае расчараваньне для арганізатараў: із радоў замежных і нямецкіх карэспандэнтаў зьявілася ўсяго толькі чатырох, асталымі былі толькі прадстаўнікі эміграцкай прэсы. І на пытаньні гэтых чатырох карэспандэнтаў адказвалі неўпапад, туманна, няскладна. Аснаўным гваздом тут узноў быў Н. Накашыдзэ, якому суфлёрыў сам «правадыр правадыроў» Я. Стэцька. Накашыдзэ ўзноў падчыркнуў аб тым, што АБН змагаецца ня толькі супраць бальшавізму, але й супраць Расейцаў наагул, і вельмі жаліўся, што замежная прэса й замежныя колы не разумеюць іх, ня цікавяцца імі, унікаюць іх і не аказваюць падтрыманьня для АБН.

Пры гэтым ён накінуўся на Амэрыканцаў за тое, што яны ў васобе Амэрыканскага Камітэту Вызваленьня ад Бальшавізму падтрымліваюць Керэнскага—Мельгунова і не аказваюць падтрыманьня для АБН (Керэнскага й Мельгунова й наагул эміграцыйных групаў Амэрыканскі Камітэт не падтрымлівае афіцыйна ўжо ад 1. 9. 1953 году). На пытаньне аднаго із журналістых, як адносіцца АБН да расейскіх антыбальшавікоў, было адказана, што гэтаксама, як і да самых бальшавікоў. Журналісты хацеў удакладніць адказ і запытаўся: «Ці ўважаеце вы іх сваімі ворагамі?». Адказ быў: «Так, гэта нашыя ворагі!». Той-жа самы журналісты задаў наступнае пытаньне: «А ўважаеце вы так-жа і тых, Амэрыканцаў, якія іх падтрымліваюць, таксама сваімі ворагамі?». Адказ быў пазытыўны: «Так, мы іх таксама лічым нашымі ворагамі!».

Прэсавая канфэрэнцыя прадаўжалася нядоўга. І гэтыя прыбылыя чатыры чужынецкія карэспандэнты хутка пакінулі канфэрэнцыю. Перад сваімі-ж эмігрантамі новаму кіраўніцтву канфэрэнцыі ня было патрэбы пазаваць: усе іх знаюць, як аблупленых, а таму і яны, улічваючы гэтую акалічнасьць, хутка закончылі і гэтую няўдалую прэсканфэрэнцыю.

Трэба адцеміць, што як аб маніфэстацыі АБН, гэтак і аб ягоным кангрэсе ды прэсканфэрэнцыі ні мясцовая нямецкая прэса, ні замежная не паведаміла літаральна аніводным радком, як не паведаміла аб гэтым ніводным словам ніводная радыястанцыя. Гэта зьяўляецца яскравым доказам таго, што АБН аказаўся поўнасьцю палітычна ізаляваным і байкатуецца ўсімі дэмакратычнымі коламі, якія дасканала ведаюць, што АБН цяпер канчальна замкнуўся ў вузкім коле ясна вызначаных таталітарных групаў, варожых дэмакратычным прынцыпам.

Правал усіх гэтых апошніх акцыяў АБН зьяўляецца лягічным вывадам той самагубнай палітыкі, на шлях якой стаў Я. Стэцька зь вернымі яму апаратчыкамі і аб якой мы сваячасова пісалі, цьвердзячы аб канцы АБН. Гэты канец і наступіў, аб чым якраз сьветчаць і правал маніфэстацыі АБН, ягонага кангрэсу і скліканай ім прэсканфэрэнцыі.

**Х. Л.**

**НОВАЯ БЕЛАРУСКАЯ КНІЖКА**

Выйшаў з друку й прадаецца .борнік вершаў **МІХАСЯ КАВЫЛЯ**

**Пад зорамі белымі**

з фотоздымкай аўтара й ілюстраванай вокладкай мастака Міколы Кругловіча. Цана 1 амэр. даляр зь перасылкай за 1 экз., а ў іншых краінах ягоная раўнавартасьць у мясцовай валюце. Заказы й грошы прысылаць на адрас:

Wladimir Pielasa, 250 East 4-th St.,
New York 9, N. Y., USA.

**ЯНКА ШАКУН**

# У вабдымках лясной цемры

(Заканчэньне з папярэдняга нумару)

Між стройных хвояў уночы барак выглядаў, быццам высокая чорная куча, і агню пры ім ня было. Цікаючыся пазладзейску, увайшлі ў сярэдзіну. Пабудаваны барак быў із хваёвых паўбярвеньняў, якіх шчапаныя й гладка вычасаныя бакі тварылі роўныя сьцены. У сярэдзіне стаялі чатыры слупы й падпіралі квадрат баляк, да якіх прыпіраліся наўскос пастаўленыя шчапаныя плашчакі, што давалі бараку чатыры сьцяны. Дзеля таго, што плашчакі стаялі касяком, дык унізу барак быў шырокі, а ўгары была невялікая квадратовая дзірка, што служыла за комін, калі ў бараку гарэў агонь. У ваднэй сьцяне была дзірка, і яна была дзьвярыма. Звонку, ад нізу да верху, сьцены былі абсыпаныя зямлёй, і ў бараку было суха ў найбольшую навальніцу. У сярэдзіне барак быў падобны да чатырохкутнай сьпічастай вежы. Каля сьценаў зробленыя із шчапаных напалам паленьняў палаткі, на якіх пасланы сухі лясны мох служылі графом месцам на спаньнё.

— Бачыце, тут навет ня дрэнна. Гэта графская рэзыдэнцыя. Графы прыяжджаюць сюды ўвечары й а заходзе сонца йдуць із лясьнікамі на запады. Вярнуўшыся, лясьнікі расьцілаюць на мох пуховікі, і графы сьпяць тут да сьвіту. Пасярэдзіне лясьнік распаліць вогнішча, дым выходзіць дзіркай уверсе, а гэтыя дзьверы застаўляюць дошкай, і ў бараку цёпла і выгодна. За гэтым бараком ёсьць другі, лясьніцкі, але ён, як прызначаны служаком, дык розьніцца і сваёй формай і выгодай. Хадзем, пакажу — сказаў Пахом.

Гэты барачок быў зусім просьценькі. На дзьвюх сошках ляжала балька і да яе, з аднаго боку, прыстаўленая невялічкая сьценка ды прысыпаная зямлёй. Пад сьценкай ня было ніякіх палатак, мох ляжаў на зямлі.

— На гэтым маху цэлую ноч у бяссоньні курчыцца лясьнік ды пілнуе графоў і іхныя фурманкі. Перад барачком раскладае агонь, і калі вецер зьмяняе кірунак, дык дым закручвае ў барачок і выядае лясьніку вочы. Раніцай лясьнік будзіць графоў, абувае ў лапці і вядзець на глушцы. Найгоршая скула лясьніку — пабудзіць графа. Той ня хоча ўставаць, лаіца, і лясьнік часамі навет заробіць аплявуху, але загад, дадзены ўвечары, трэба споўніць, інакш адмовілі-б службу. Усё гэта я перажыў і ведаю, — сказаў Пахом уздыхнуўшы, ды памаўчаўшы, быццам сам да сябе, гаварыў ізноў: — Так, так, няроўны людзкі лёс і няроўна людзі жывуць. Жыцьцё адных прыраўнаваць да другіх нельга. Адныя жывуць ды із жыцьця цешацца, а другія жыцьцё праклінаюць. А хто гэтаму вінаваты, — мы ня ведаем. Можа прызначэньне, можа само жыцьцё, а можа навет Бог, што жыцьцё нам даў.

Пасьля апошніх сказаў Пахом адвярнуўся плячыма, але Раман зацеміў, што стары выціраў сьлёзы. Мамэнт быў вельмі няпрыемны, і Раман ня ведаў, як захавацца, бо знаў, што Пахом плакаў ня з радасьці. Дык вельмі ўсьцешыўся, калі Пахом лопнуў яго па плячы, кажучы:

— Хадзем адгэтуль, але не ў барак. Пад голым небам чалавеку весялей, бо бліжэй да прыроды, а ў бараку шмат графскіх блохаў. Досыць напіліся мае крыві, калі яна была маладая й плыла ў маіх жылах ня толькі для мяне, але й для мае сям'і.

Адыйшліся й лягі на градзе. Месяц зайшоў, і лес затапіла чорная цемрадзь. Яна веяла на Рамана нейкім шумам і яму здавалася, што навет хвоі перамянілі тон свайго шуму. Пахом ляжаў моўчкі і ня перашкаджаў яму лятуцець. Можа стары адыйшоў думкамі да мінулых маладых год, а можа разважаў пра сваю бліскую старасьць і зьнямогу.

Раптам павучыньне іхных лятункаў і спакой ночы перарвала быццам чалавекам крыкненае «Ой»! Нейдзе трэснуў пераламаны сухі сук, а па градзе задуднелі цяжкія крокі, і нешта кіравалася проста на іх. Раманава сэрца застукала мацней, у горле забралася паветра, а ў роце перасохла. Ён хацеў нешта сказаць, але хаця й паварушыў губамі, голас ня выйшаў. Рукі й ногі трэсьліся, а ў скроні стукала, як молатам. Знаў толькі, што гэта ад страху, але ня ведаў, што страшыла, а на здогады ня было часу. Штосьці няведамае і ў цемрадзі нявідочнае гналася проста на іх. Глянуўшы на Пахома, быццам шукаючы ў ім абароны, зьдзівіўся, што той спакойна й бяз страху ўзяўся за сваю стрэльбу ды залажыў у яе патрон. Укленчыў на адно калена і, павярнуўшыся да Рамана, шэптам сказаў:

— Прырыхтуйце стрэльбу. Крык, што мы чулі, гэта перапалоханай казы. Яе ловяць ваўкі, і ўсе бягуць на нас. Як параўнаюцца, дык цаляйце ў што будзе бліжэй.

Раман не пачуў Пахома, а тупат па градзе зьбліжыўся, і ён не пасьпеў узяцца за сваю ламанку, як густую цемрадзь перарэзала вузенькая пасма сіняга агоньчыку із Пахомавай стрэльбы. Гукнуў адрывісты стрэл і расплыўся па лесе рэхам. Адтуль, куды была скіраваная Пахомава стрэльба, нешта азвалася глухім жаласным стогнам, і нейкі ніто крык, ніто брэх далучыўся да рэха стрэлу.

Раману пацямнела ўваччу яшчэ больш, у скроні стукнула мацней, і ня мог дыхаць. Ці пасьля стрэлу быў тупат па градзе, ня чуў, як таксама ня ведаў, што тут рабілася.

— Бачыце, як дзіўна сталася? Каза, ратуючы сваё жыцьцё, прывяла ваўка да сьмерці. А ён, гонячыся за пажыткам, каб супакоіць свой голад, неспадзявана трапіў на канец свайго жыцьця. Ці-ж гэта ня дзіва? — сказаў Пахом, падымаючыся із калена.

— Дзядзька Пахом, я нічога ня ведаю, што тут было. Я так спалохаўся, што ня помніў навет, дзе я. Мне здавалася, што нас ловяць лясьнікі, і каб меў сілу, дык уцякаў-бы, як жывы — зь яшчэ ня мінулым страхам адказаў Раман.

Пахом вясёла засьмяяўся, як умеюць сьмяяцца людзі пасьля вялікага гэройства і, лопаючы Рамана па плячы, як найлепшага сябру, тлумачыў:

— Тут ня было чаго палохацца. Ці-ж самі ня бачылі, што пераскочыла каля нас?

— Не. Мне зрабілася так цёмна ўваччу, што й дзядзьку ня бачыў.

Пахом засьмяяўся яшчэ весялей і, узяўшы Рамана за руку, сказаў:

— Хадзем, пабачыце тое, чаго напалохаліся. Спадзяюся, цяпер яно не страшное. Мерцьвякоў баяцца толькі бабы ды малыя дзеці.

За крокаў пяцьдзесят знайшлі зьвярыну. Пахом запаліў серніка, і пры ягоным слабым сьвятле пазналі, што Рамана наполохала. Із падкурчанай пад сябе галавой, нефарэмна выцягнуўшы ногі й адкінуўшы даўгі хвост, ляжаў шэры воўк.

— Бачыце гэтага гэроя? Чаго-ж яго баяцца? — сказаў Пахом, наступіўшы ваўку на адкінуты хвост.

— Дзядзька Пахом, я ня ведаў, што тут робіцца, думаў, што лясьнікі і быў ужо ледзь ня ў турме. Каб ведаў пра гэты зьвярыны спацыр, дык не баяўся-б таксама. Але мне дзіва, як вы ў гэтакай цемрадзі маглі пацэліць?

— А пацэліў нядрэнна, якраз куды трэба. Шкода толькі, што другі ўцёк. Каб гэтак удзень, дык яму не ўдалося-б, але ведама — ноч, цемрадзь і ён, шэльма, скарыстаў з мае сьляпні. Мае вочы ўжо ня сьвецяць, як даўней бывала. Не, не, ужо ня тое.

— Дык тут быў яшчэ адзін? — зьдзівіўся Раман.

— А так. Яны гналіся за казой удвух. Пэўня ён і яна. Зараз даведаемся, каторае зь іх мела меншае шчасьце да жыцьця, — запаліў сярніка Пахом і заявіў: — Уцёк самец. А бедная козачка спужалася стрэлу й аж крыкнула, але воўк не пабег за ёй, зьвярнуў у бок.

— Дзядзька Пахом, за ваш спрыт вам належыцца барыш, — сказаў Раман, дастаючы із заплечніка пляшачку із мядоўкай.

— О, хочаце й па ваўку справіць хаўтуры? — зажартаваў стары, а тады загаварыў паважна: — самі хаця й спалохаліся, але будзеце мець воўчую скуру. Яна ня мае такой вартасьці, як зімовая, але яшчэ нядрэнная.

— О, не, дзядзька забілі ваўка, дык і скура вашая. Якім правам яна мая?

— Якім правам? Гм, правам «кадука». Кажуць, што ёсьць і гэткае права, — адказаў Пахом сьмяючыся. — Я быў пасярэднікам гэтай справы напачатку, дык павінен быць ім і на канцы. Я паслаў ваўку кулю й сьмерць, а ягоную скуру аддаю самім. Трэба зацягнуць яго ў хмызьняк, бо тут, ля бараку, скураваць ня выпадае, — пацягваючы із пляшачкі, правіў Пахом.

Воўк хаця й няжывы, але перайшоў зь месца сьмерці ў зарасьні, а дзеля павагі ягонай сьмерці пры ім гарэла невялічкае полыма і, па часінах пятнаццаці, знайшоў ён сабе прытулак пад мякім мохам, а ягоная скура месца ў Раманавым заплечніку.

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011



# Гішпанія для Беларусі

## Гішпанскія дзеці моляцца за Беларусь

Галоўная Ўправа Жанчын Гішпанскае Каталіцкае Акцыі кінула лёзунг, каб дзеці кажнае дыецэзіі адаптавалі сабе адну з краінаў, якая сяньня стогне пад прыгнечаньнем бальшавіцкае тыраніі, і маліліся за яе. Гэты шляхотны кліч быў чула ўспрыняты ўсімі нашымі маленькімі сябрамі ў Гішпаніі і даў свае прыгожыя вынікі. Наш паняволены беларускі народ выбралі сабе дзеці дыецэзіі Фэрроль (бацькаўшчына генэрала Франка), у Галіцыі.

Гэты так шляхотны чын гішпанскіх дзяцей мы павінны належна ацаніць і з свайго боку заманіфэставаць нашую шчырую беларускую ўдзячнасьць. Лісты падзякі можна кіраваць непасрэдна на наступны адрас: Consejo Diocesiano de las Mujeres de Accion Catolica, El Feroll — Galicia (Espagne), або за пасярэдніцтвам БАКА «Рунь» у Гішпаніі: Donoso Cortes, 63. Madrid.

## Акт у чэсьць перасьледванай Цэрквы

19 красавіка сёлета а гадзіне 19.30, у залі Гішпанскага Нацыянальнага Навукова-Дасьледавальнага Інстытуту ў Мадрыдзе, адбыўся грандыёзны акт-дэманстрацыя, прысьвечаны Царкве, крывава перасьледванай сяньня бальшавікамі ў краінах за Зялезнай заслонай.

У Прэзыдыюм акту-дэманстрацыі, побач зь Я. Э. Апостольскім Нунцыям Антонуіці, які старшынствараў, уваходзілі: міністар замежных справаў Гішпаніі сп. Марцін Артахо, міністар юстыцыі сп. Ітурмэндзі, прэзыдэнт Дзяржаўнае Рады сп. Ібаньез Марцін, Я. Э. біскуп Візкарра, прэзыдэнт Інтэрнацыянальнай Мужчынскай Каталіцкай Фэдэрацыі сп. Я. М. Отэро Наваскуэз і Я. Э. біскуп Павані з Апостальскае Нунцыятуры.

З паняволеных краінаў былі рэпрэзэнтаваныя сваімі прадстаўнікамі: Балтыцкія дзяржавы, Беларусь, Кітай, Мадзяршчына, Польшча, Румынія, Славаччына, Славэнія, Украіна, Харваччына і Чэхія. За прэзыдыяльным сталом у руках студэнтаў красаваліся, пачынаючы ад беларускага, сьцягі ўсіх выжэй успомненых народаў, сьцягі, як падчыркнулі прамоўцы, «зьлітыя крывёю змаганьня супраць камуністычнай тыраніі за свае прыродныя й людзкія правы».

Вялікая заля Інстытуту была перапоўненая выдатнымі прадстаўнікамі гішпанскага навуковага й палітычна-грамадзкага сьвету. Прысутнічалі гэтак сама дыпляматычныя прадстаўнікі іншых эўрапэйскіх і пазаэўрапэйскіх краінаў. Мэтаю акту было заманіфэставаць салідарнасьць з народамі, што сяньня церпяць бальшавіцкую няволю, і заклікаць гішпанскае грамадзтва, каб яно, у меру сваіх магчымасьцяў, прыйшло з помаччу гэтым народам у няшчасьці і прыняло актыўны ўдзел у іхным змаганьні супраць дзікага камуністычнага барбарызму.

## За нашую свабоду

Гішпанскі народ адзіны на Захадзе, што на собскія вочы бачыў бальшавізм у практыцы і які ёсьць адзін зь першых, што ськінуў путы камуністычнай няволі. Таму ён сяньня найбольш спачувае ўсім тым нешчасьлівым народам, што яшчэ стогнуць пад прыгнётам маскоўскай тыраніі. Гішпанські народ, які панёс вялізарныя ахвяры ў змаганьні за сваю свабоду й хрысьціянскія ідэялы, складаючы на аўтар змаганьня больш мільёна сваіх найлепшых сыноў, сяньня далучаецца да тых, што церпяць яшчэ зьдзек бязбожнага дэспатызму, і зьвяртаецца з просьбай да Ўсемагутнага, каб аблегчыў ды скараціў той цярністы шлях, якім яны йдуць ужо столькі год. Усе Гішпанцы, пачынаючы ад старэйшага й канчаючы малодшым пакаленьнем, маніфэстуюць нам на кажным кроку сваю салідарнасьць у змаганьні з нашым супольным ворагам, з ворагам усяго чалавецтва.

Не адзін прыклад гэтай салідарнасьці гішпанскага народу мелі магчымасьць мы ўжо пабачыць. Ня так даўно былі мы сьведкамі грандыёзнай дэманстрацыі, прысьвечанай перасьледванай Царкве ў паняволеных бальшавікамі краінах, калі перадавое гішпанскае грамадзянства пратэставала супраць гвалту й тэрору, заклікаючы ўвесь вольны сьвет да станоўчага змаганьня супраць камуністычнае заразы. І як-жа не назваць шляхотным пачын дзяцей Фэрольлю, якія ўсе свае малітвы, добрыя ўчынкі і пакуты ахвяроўваюць за наш паняволены беларускі народ.

Гэтая салідарнасьць была заманіфэставаная нам яшчэ раз, 14 красавіка сёлета, калі а гадзіне 20,30 пры Паляцьё дэль Орыентэ сабраліся тысячы народу, каб прыняць удзел у ўрачыстай Крыжовай Дарозе, арганізаванай Мужчынскім Дыяцэзіяльным Камітэтам Каталіцкае Акцыі, а прысьвечанай спэцыяльна нашым паняволеным краінам.

Каля пяцёх тысячаў мужчын зышлося на пляцы дэ ля Армэр'я, каб пад адкрытым небам прасіць Хрыста-Збаўцу апекі над нашымі бацькамі, сёстрамі й братамі, якія перажываюць нячуваныя зьдзекі і крыўды маскоўскіх уладароў, ды маліцца да яго, каб вярнуў паняволеным народам свабоду й мір.

У цэнтры вялікага пляцу на спэцыяльным падвышэньні стаяў вялізарны дзераўляны крыж, побач якога былі ўладжаныя мікрафоны гішпанскага радыя. Кажнаму народу была прысьвечаная адна з чатырнаццаці станцыяў Крыжовае Дарогі, першая зь якіх належыла Беларусі. Кажны народ, у сваю чаргу ,быў рэпрэзэнтаваны двума прадстаўнікамі, адзін зь якіх трымаў крыж, а другі плякат з назовам дадзенае краіны. Пасьля агульнай малітвы пачаўся ўрачысты крыжовы паход. Тысячы людзей затрымоўваліся перад кажнай станцыяй і на працягу дзесяці хвілінаў маліліся за той народ, якому яна была прысьвечаная. Пры мікрафонах-жа, адначасна, чыталася адмысловая малітва, якая — за беларускі народ — канчалася зваротам-просьбай да нашае Нябеснае Ўладаркі, Жыровіцкае Божае Меці, каб «малілася за волю Беларусі і не пакідала ейных сыноў у змаганьні за свае сьвятыя ідэялы». Пасьля гэтага прадстаўнік ад нацыянальнасьці гаварыў малітву ў сваёй роднай мове («Ойча наш» і «Прывітаная будзь»). Урачысты акт Крыжовае Дарогі працягнуўся аж да 23 гадзіны.

Гішпанская прэса прысьвяціла гэтаму акту шмат месца на сваіх балонах.

**В. Сенкевіч**

## Сакавіковае сьвяткаваньне у Манчэстэры

Беларусы гораду Манчэстэр і ягоных аколіцаў урачыста адзначылі 36-ую гадавіну Акту 25-га Сакавіка дня 4 красавіка сёлета ў Беларускім Клюбе. Акадэмію арганізавала Ўправа мясцовага Аддзелу Згуртаваньня Беларусаў у Вялікабрытаніі. Гэтага-ж дня сьвятар БАПЦарквы а. А. Крыт адправіў Божую Службу ў англіканскай царкве сьв. Яна, а пасьля адслужыў спэцыяльны малебен, прысьвечаны вялікай гадавіне, і сказаў прыгожае казаньне. Малебен і казаньне ўзварушылі вернікаў да глыбіні сэрца. Айцец Крыт падчыркнуў, што гэты дзень быў радасьцю й шчасьцем для нашага народу, але, на жаль, гэтая радасьць і шчасьце трывалі нядоўга. Але мы перакананыя й глыбока верым, што гэты дзень прыйдзе ўзноў і тады толькі запануе запраўдная свабода для нашага хрысьціянскага народу. Тады будзем у сваіх сьвятынях славіць Усемагутнага Госпада Бога. Імкненьні нашыя ведамыя: вярнуцца ў Вольную й Незалежную Беларускую Рэспубліку.

У прыгожа ўдэкараванай сьвятліцы Беларускага Клюбу адбылася ўрачыстая акадэмія, прысьвечаная 25 Сакавіку. Акадэмію адкрыў сакратар Аддзелу ЗБВБ сп. М. Віценчык, які, шчыра й сардэчна прывітаўшы удзельнікаў, адчытаў прывітальны ліст старшыні Аддзелу ЗБВБ сп. П. Шыркоўскага, які з паважных прычынаў ня мог быць прысутным. Прывітальныя лісты ад Галоўнай Управы ЗБК і ад сп. В. Сенкевіча з Мадрыду адчытаў сп. М. Яскевіч, у якіх было моцна падчыркнутае значэньне Акту 25 Сакавіка, што навет і нашыя ворагі яго поўнасьцю дацэньваюць. Аднамінутнай цішынёй была ўшанаваная памяць Гэрояў, якія палі за ідэі 25 Сакавіка.

Ад украінскіх арганізацыяў: Саюзу Ўкраінцаў у Вялікабрытаніі, Саюзу Ўкраінскай Моладзі і Саюзу Ўкраінскіх Камбатантаў шчыра й сардэчна вітаў капітан Пэтлюраўскай арміі др. К. Васіленка, які насьветліў дакладна тыя падзеі, у якіх сам браў чынны ўдзел, выказаўшы сваю нязломную веру, што адродзяцца Беларуская і Ўкраінская рэспублікі і будуць запраўды вольнымі й незалежнымі дзяржавамі.

Урачыстасьць закончылася адыграньнем беларускага нацыянальнага гымну.

**М. Яськевіч**

### БЕЛАРУСКІЯ РАДЫЯПЕРАДАЧЫ З РЫМУ

**Падаецца да агульнага ведама, што беларускія перадачы цераз Ватыканскае Радыё ў Рыме адбываюцца цяпер два разы ў тыдзень у серады і пятніцы а гадзіне 18,15 на кароткіх хвалях: 25,67; 31,10; 41,21; 49,75 і на сярэдняй хвалі — 196.**

# Беларусы ў Аўстраліі

### У БРЫСБЭЙНЕ

У нядзелю 28 сакавіка сёлета Беларусы Брысбэйну й ваколіц сабраліся ў сьвятліцы ЗБВ, каб урачыста адзначыць 36-ую гадавіну Вялікага Сакавіковага Акту. Урачыстасьць пачалася адсьпяваньнем нацыянальнага гымну, пасьля чало былі зачытаныя шматлікія павіншаваньні ад беларускіх і іншанацыянальных арганізацыяў, а таксама заслуханы кароткі даклад старшыні мясцовага аддзелу ЗБВ на тэму «Нашае жыцьцё для Сакавіка». Пазьней спадарычня Ліна Кавалеўская і спадар Аўген Несьцяровіч раздалі значкі «Дару 25 Сакавіка 1918—1954», зьбіраючы ахвяры на Фонд Рады БНР. Пасьля афіцыйнай часткі, удзельнікі сьвяткаваньня заняліся разважаньнямі і плянаваньнем выдавецкай акцыі ЗБВ, а таксама пашырэньня дзейнасьці на вонкавым адрэзку.

### У АДЭЛЯЙДЗЕ

У нядзелю 28 сакавіка сёлета Беларусы Адэляйды й бліжэйшых аколіц сабраліся ў Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царкве, каб памаліцца Ўсемагутнаму Богу за посьпех нашай нацыянальна-вызвольнай справы. Сьв. Літургію адправіў а. пратаерэй М. Шчурко, у царкве прыгожа сьпяваў хор Украінцаў, якія прыйшлі ў гэты дзень, каб адзначыць гэтую важную гадавіну. Пасьля гэтага сп. інж. П. Трысмак прачытаў зьмястоўны рэфэрат на тэму «25 Сакавік», у якім прааналізаваў увесь пэрыяд вызвольнага змаганьня, якое прывяло да акту 25 Сакавіка. Урачыстасьць закончылася адсьпяваньнем нацыянальнага гымну.

**Вэтэран**

### У ПЭРТ

Гадавіна 25-га Сакавіка была адзначаная Беларусамі гораду Пэрт даволі ўрачыста. У афіцыяльнай частцы праграмы сп. Дуброўскі прачытаў прыгожы й глыбокі рэфэрат на тэму сакавіковае гадавіны, пасьля чаго адбыўся сяброўскі вечар. Міла гучэлі нашыя народныя песьні, найграныя на грамафонныя пліткі. Заліваўся гармонік у руках сп. Мароза, які ўсіх прысутных душою занёс у нашую родную вёску. Сп. Мароз із жонкаю адзначыліся таксама выкананьнем «Лубка», а сп. Ляшкевічыха песьняю «Слуцкія ткачыхі». Не абыйшлося і бяз скокаў. Усіх агортвала цёплая сяброўская атмасфэра і з жалем позьняю ноччу прыйшлося разьвітацца зь сябрамі.

### БЕЛАРУСЫ ВІТАЮЦЬ КАРАЛЕВУ

Каралеўскае візыты чакала сталіца Заходняе Аўстраліі — Пэрт гадамі, дык нічога дзіўнага, што горад адпаведна прыгатаваўся да гэтае асаблівае падзеі. Усё навокал зіхацела і красавалася. 29 сакавіка адбыўся праезд каралеўскае пары па Пэрце. Тысячы людзей ціснуліся, каб пабачыць сваю каралеву. Усе арганізацыі мелі вызначаныя для сябе месцы. Для Беларусаў выпаў прыгожы пункт у «Рояль Парк». Дзесяць нашых параў у прыгожых нацыянальных вопратках стаяла ў першым радзе, а каралева, праяжджаючы міма, нас прывітала ўсьмешкаю. Пасьля гэтага групаю прайшліся мы па галоўных вуліцах гораду, прыцягваючы да сябе ўвагу Аўстралійцаў. Многія цікавіліся, хто мы, і прасілі пазаваць да здымкаў.

**А. Браз**

### ПРОСЬБА БЕЛАРУСАЎ У БРЫСБЭЙНЕ

У першай палавіне сакавіка сёлета ў Брысбэйне пры Задзіночаньні Беларускіх Вэтэранаў заснаваўся Ансамбль Беларускай Песьні й Драматычны Гурток пад кіраўніцтвам сп. Аўгена Несьцяровіча.

Ансамбль і Драматычны Гурток зьвяртаецца да ўсіх з просьбай аб прысыланьні на ніжэй пададзены адрас беларускіх п'есаў, а так-жа тэкстаў і нотаў беларускіх песьняў. Амбіцыяй Ансамблю й Гуртка ёсьць даць некалькі нашых мастацкіх паказаў і канцэртаў ня толькі ў Брысбэйне, але і ў іншых беларускіх асяродзьдзях у Аўстраліі. Мы верым, што нашыя кампазытары, выдавецтвы, а таксама й прыватныя асобы адгукнуцца на нашую просьбу і будуць нам высылаць прошаныя тэксты, якія, у выпадку патрэбы, будуць пасьля выкарыстаньня зьвернутыя назад. Наш адрас: Mr. Auhen Niesciarovic, 60, Fisher St., East Brisbane, Q-ld, Australia.

**ЗБВ у Брысбэйне**

# Беларускія кніжкі

Видавецтва „Бацькаўшчыны"

**ЯКУБ КОЛАС**

**Новая Зямля**

**Паэма зь вялікім і грунтоўным крытычным артыкулам Р. СКЛЮТА.**
**Балонаў 246+XXXII.**
**Цана 3 амэр. даляры.**

**ЯНКА КУПАЛА**

**Тутэйшыя**

**П'еса ў чатырох дзеях з крытычным артыкулам Р. СКЛЮТА.**
**Балонаў 83.**
**Цана 1,30 амэр. даляраў.**

**ЯНКА КУПАЛА**

**Раськіданае гняздо**

**Драма ў пяцёх актах з крытычным артыкулам Р. СКЛЮТА.**
**Балонаў 58+XV.**
**Цана 1 амэр. даляр.**

**АНДРЭЙ МРЫЙ**

**Запіскі Самсона Самасуя**

**Сатырычная аповесьць з крытычным артыкулам Р. СКЛЮТА.**
**Балонаў 88.**
**Цана 1 амэр. даляр.**

**ЛУКАШ КАЛЮГА**

**Нядоля Заблоцкіх**

**Аповесьць зь вялікім крытычным артыкулам Р. СКЛЮТА.**
**Цана 1,50 амэр. даляраў.**

**Друкуюцца**

**й хутка выйдуць у сьвет:**

**ЯНКА КУПАЛА**
**З УСТУПНЫМ АРТЫКУЛАМ М. РАВІЧА**

**Выбар паэзіі**

**Каля 500 балонаў вялікай васьмёркі. Цана: у мяккай вокладцы — 8 амэр. даляраў, у цьвёрдай палатнянай вокладцы — 10 дал., на люксусовай бліскучай паперы ў цьвёрдай палатнянай вокладцы — 12 амэр. даляраў.**

**ВЛАСТ (ВАЦЛАЎ ЛАСТОЎСКІ)**

**Творы**

**зь вялікім крытычным артыкулам Р. СКЛЮТА.**

**Альманах творау беларускіх паэтау і пісьменьнікау на эміграцыі**

**У краінах, паза Задзіночанымі Штатамі Амэрыкі й Канадай, цана ў мясцовай валюце, раўнавартаснай выжэй пададзенай цане ў амэрыканскіх далярах.**

**Выпісваць можна: непасрэдна з Адміністрацыі «Бацькаўшчыны» і з нашых Прадстаўніцтваў у паасобных краінах.**

# „Пяяць для Бацькаўшчыны"

(Заканчэньне з 3-ай балоны)

e Professionisti з тытулам Cavaliere Academico. Аднак у меру магчымасьцяў і далей браў лекцыі ў ведамых рымскіх прафэсароў. Няраз пяяў ужо ў найбольшых залях Рыму — Castel Sant' Angelo, Palazzo Barberini, Circolo Artistico... Але аб гэтым пісаць ня варта, — схамянуўся ён зноў.

— А якія-ж пляны на будучыню?

— Пяяць для Бацькаўшчыны.

Цяжка перадаць тон, якім былі кінутыя гэтыя словы. Яны палі так натуральна, без патосу, але зь дзіўнай нутраной сілай.

Калі браць канкрэтна, дык я дасюль не прадаў і ня зьбіраюся прадаваць душы імпрэсарыё. Маю ўсе магчымасьці кантракту зь італьянскім радыё й тэлевізіяй. Але гэта ўсё лічу, як часовае. Маё заданьне — папасьці ў опэру. А пасьля — шлях адчынены ўсюды.

— Ну, а як спадабалася ў нас?

— Браткі вы мае, што тут гаварыць? Я не спадзяваўся ні такога прыняцьця, ні такое атмасфэры. Студэнты, работнікі — усе. Але які букет атрымаў я ад работнікаў... — Вочы ягоныя крыху заімгліліся. — І добрую работу вы робіце, хлопцы...

Мы былі ўдзячныя яму. Удзячныя за прызнаньне, і можа шчэ больш за тое, што, ня гледзечы на ўсю жыцьцёвую завіруху, на спакусы з усіх бакоў, ён нідзе не зьвярнуў з дарогі да свае мэты: пяяць для Бацькаўшчыны.

✳

Выбач, дарагі Пётра, за маю нядыскрэтнасьць. Выбач і за тое, што дазволю сабе скончыць гэтыя пару словаў аб Табе радкамі, якія Ты ўпісаў нам у альбом. Яны скажуць больш, чымся ўсё дасюль напісанае:

Надыйдзе час — нянавісьць зьнікне
З прастораў сяньняшняй зямлі,
І Беларус дыхне свабодна
На ўлоньні новае сям'і.

Ды помні, сябра: будзь сабою —
Ня дай забраць душу ў палон!
Будзь сынам ты свайго народу
Аж да апошніх сваіх дзён.

Бо ведай, брат, хто адракаўся
Ад краю, дзе ўзрос, дзе жыў,
Пад скурай хто чужой хаваўся,
Той пагарджаны ўсімі быў.

Каб з чыстаю душой памерці,
І вочы лёгка мне закрыць, —
Для Беларусі аж да сьмерці
Я буду працаваць і жыць.

**Ул. Неманові́ч**

### ВЫПІСВАЙЦЕ Й ПАШЫРАЙЦЕ БЕЛАРУСКІЯ КНІЖКІ З КРЫВІЦКАГА НАВУКОВАГА ТАВАРЫСТВА ПРАНЦІША СКАРЫНЫ

1. Гадавік «Веды» за 1951 год, цана 1.50 даляра;
2. Гадавік «Веды» за 1952 год, цана 3.50 даляраў;
3. Абодвы гадавікі «Веды» за 1951 і 1952 г. г. разам у харошай палатнянай аправе, цана 6.50 даляраў;
4. Гадавік «Веды» за 1953 год, цана 2,55 даляраў;
5. Др. Я. Станкевіч: «Этнаграфічныя й гістарычныя тэрыторыі й граніцы Беларусі», бал. 24. Да кніжкі даданая этнаграфічная й гістарычная мапа Беларусі. Цана 50 цэнтаў;
6. Dr. John Stankievich: «Etnographical and Historical Territories and Bounderis of Whiteruthenia», бал. 16. Да кніжкі даданая этнаграфічная й гістарычная мапа Беларусі ў ангельскай мове. Кніжка й мапа вельмі годзяцца да пашырэньня ведамкаў пра Беларусь паміж чужнікамі. Цана 40 цэнтаў;
7. Др. Я. Станкевіч: «Маленькі маскоўска-беларускі слоўнічак фразэалягічны й прыказкаў», цана 40 цэнтаў;
8. Др. Я. Станкевіч: «Некаторыя праўніцкія тэрміны беларускія», бал. 84. У кніжцы, апрача разгледжаных каля 900 беларускіх праўніцкіх тэрмінаў, ёсьць на 6 балонах сьпісаньне расейскіх тэрмінаў, каторымі перакладзеныя тэрміны беларускія. Цана 95 цэнтаў;
9. Др. Я Станкевіч: «Мова рукапісу Аль Кітаб», цана 95 цэнтаў;
10. Кветка Вітан: «Лявон Вітан-Дубейкаўскі» (лацінкай), жыцьцяпіс слаўнага беларускага архітэктара і запісаныя ім 670 беларускіх прыказкаў. Цана 50 цэнтаў.

Выпісваючы, просьба пасылаць грошы на гэткі адрас:
**Mr. John Stankievich, 6 Vanderwoort Place, Brooklyn 37, N. Y., U. S. A.**

### ШУКАЮЦЬ

**Брата Альбіна Касьпіровіча,** народжанага ў 1922 г. ў Плешчаніцкім раёне Менскае акругі, які ў 1942 г. быў вывезены на працу ў Нямеччыне, шукае Ядвіга Данілюк. Весткі слаць на адрас:
Jadwiga Danyljuk, Lot. 601. Meredith St., Broadmeadows, Vjct., Australia.

### АДКАЗЫ РЭДАКЦЫІ

**Сп. Г. Юзэфовічу, Бад Годэсбэрг (Нямеччына):** Хаця генэрал Даўкантас і займаў паважнае становішча, будучы летувіскім дыпляматычным прадстаўніком у Аргентыне, аднак прысланы Вамі ягоны артыкул «Беларусы», поўны яўнага хвальшу й пашквілянцтва, кваліфікуе яго як чалавека зусім безадказнага й непаважнага. На такія артыкулы мы з прынцыпу не адказваем.

**Сп. др. Я. М. у Аўстраліі:** За фэльетон «Рибак рибака видит из далека» вельмі дзякуем, але, на жаль, зьмясьціць яго ня можам, бо гэта была-б лішняя рэкляма для людзей, якія не заслугоўваюць на ніякую ўвагу: ні на добрую, ні навет на благую.

**Сп. Янку З., Лювэн (Бэльгія):** Вашага рэпартажу «Падарожжа за Ля Манш», ня гледзячы на ягоную публіцыстычную вартасьць, зьмясьціць, на жаль, ня можам, бо на гэтую самую тэму быў зьмеш-

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011